# МАРАЛЬНАЕ І ЭСТЭТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ Ў ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

Бура Юлія Аляксееўна
УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна

Літаратурнае чытанне – школьны прадмет, галоўнай задачай якога з'яўляецца эстэтычнае і маральна-этычнае развіццё і выхаванне вучняў. Асноўны змест выхаваўчага ўрока ў тым, каб вучні малодшых класаў пранікалі ў змест мастацкага твора, разбіраліся ў яго пабудове, жанрах, выразных сродках.

Мэта вучэбнага прадмета "Літаратурнае чытанне" – шляхам чытання і асэнсавання літаратурнага твора далучыць малодшага школьніка да нацыянальных і агульначалавечых духоўных каштоўнасцяў, сфарміраваць яго як культурнага чытача, які выяўляе цікавасць да кніг і чытання, праяўляе грамадзянскія, маральныя, эстэтычныя пачуцці і творчую актыўнасць, валодае трывалым навыкам чытання, спосабамі самастойнай працы з тэкстам і дзіцячай кнігай.

Чытанне з'яўляецца не толькі прадметам навучання, але і сродкам уваходжання вучняў у свет мастацкай літаратуры, універсальным сродкам іх дзейнасці па авалоданні сістэмай паняццяў, якія складаюць змест усіх навучальных дысцыплін. За кошт авалодання ўменнем чытаць і пісаць вучні набываюць здольнасць лепш разумець людзей, прыроду, усю навакольную рэчаіснасць, больш выразна і дакладна выказваць уласныя пачуцці і думкі. У працэсе сталення вучняў чытанне становіцца крыніцай і сродкам іх самаадукацыі і самавыхавання.

Літаратурнае чытанне з'яўляецца неабходнай састаўной часткай маўленчай дзейнасці вучняў, выконвае найважнейшую камунікатыўную функцыю, служыць дзейсным сродкам сацыялізацыі, выхавання і развіцця асобы. "Літаратурнаму чытанню" належыць эстэтычная функцыя фарміравання эмацыянальна-пачуццёвай сферы, узнаўляючага ўяўлення, вобразнага мыслення вучняў, паколькі аб'ектам чытання з'яўляецца мастацкі твор, які пабудаваны па законах мастацтва. У працэсе эмацыянальна-вобразнага ўспрымання мастацкіх тэкстаў адбываецца развіццё маральна-эстэтычных уяўленняў дзяцей, выхоўваецца культура пачуццяў.

Маральна-эстэтычны патэнцыял літаратуры дазваляе рэалізаваць выхаваўчую функцыю і ажыццяўляць грамадзянскае і маральна-эстэтычнае выхаванне малодшых школьнікаў.

"Літаратурнае чытанне" належыць да дысцыплін эстэтычнага цыклу, паколькі прадметам вывучэння ў ім з'яўляюцца не веды самі сабе, а творы

мастацтва слова і спосабы літаратурна-творчай дзейнасці. Змест прадмета забяспечвае вобразнае спасціжэнне свету, фарміраванне эмацыянальна-каштоўнасных адносін, назапашванне вопыту творчай дзейнасці.

Праца настаўніка на ўроках “Літаратурнага чытання” павінна быць арганізавана па дзвюх прыярытэтных асновах: маральным і эстэтычным, паколькі маральна-этычнае выхаванне – гэта мэта вывучэння літаратуры ў школе, а літаратурная адукацыя, змест якой – арганізацыя паўнацэннага ўспрымання вучнямі-чытачамі мастацкага тэксту, – гэта шлях, сродак вырашэння гэтай мэты. Трэба так арганізаваць вучэбны працэс і пазакласную працу, каб вучні думалі над сур’ёзнымі маральна-этычнымі праблемамі, спрачаліся, перажывалі і спачувалі героям, хацелі жыць па гэтых маральных правілах.

На ўроках літаратурнага чытаня вучні знаёмяцца з мастацкімі творамі з вялікім маральна-этычным патэнцыялам. Каб успрыняць эстэтычныя і маральныя каштоўнасці, неабходна, каб вучні на ўроку думалі аб прачытаным, суперажывалі героям, ацэньвалі іх учынкі, асэнсоўвалі іх праблемы, суадносілі іх жыццё са сваім жыццём, імкнуліся рабіць учынкі ў адпаведнасці з успрынятымі маральнымі нормамі. Чытаючы і аналізуючы твор, вучань павінен задумвацца пра важныя пытанні быцця, пра праўду і няпраўду, любоў і нянавісць чалавека і яго месца ў свеце. Вядома, якую важную ролю ў арганізацыі працэсу асэнсавання праблем адыгрывае эмацыянальны фон дзейнасці вучняў, арганізацыя момантаў суперажывання, паколькі ў спасціжэнні мастацкага тэксту асабліва важны прынцып спалучэння пачуццёвага і рацыянальнага пазнання, а эмацыйныя перажыванні з’яўляюцца ўмовай успрыняцця маральных каштоўнасцей. Акрамя суперажывання, асновай фарміравання маральна-этычных перакананняў з’яўляецца ацэнка. Ацэньваючы ўчынкі літаратурных герояў, вучань-чытач суадносіць свае ўяўленні пра тое, што такое добра і што такое дрэнна, з маральнымі каштоўнасцямі свайго народа і чалавецтва і ў канчатковым выніку ўспрымае “чужое” як “сваё”, атрымлівае ўяўленні пра нормы паводзін і ўзаемаадносін людзей, якія кладуцца ў аснову яго маральных уяўленняў і асобасных якасцей. Задача настаўніка – арганізаваць паўнацэннае, глыбокае ўспрыманне вучнямі ўсёй інфармацыі, закладзенай у тэкст, дапамагчы ім уявіць сабе малюнкі твора, створаныя пісьменнікам, эмацыянальна адазвацца на пачуцці аўтара і герояў, зразумець аўтарскую думку і па меры магчымасці ўбачыць, як усё гэта перадае нам, чытачам, мастак слова. Іншымі словамі – сфарміраваць чытацкія ўменні і навыкі, галоўныя з якіх: 1) уменне ўявіць сабе малюнак, напісаны аўтарам твора; 2) суперажываць героям і аўтару; 3) зразумець галоўную думку твора, яго ідэю; 4) усвядоміць сваю пазіцыю і перадаць яе ў форме вуснай ці пісьмовай мовы.

Такім чынам, зместам урока літаратурнага чытання з’яўляецца літаратурнае маральна-эстэтычнае развіццё; фарміраване чытацкіх уменняў і навыкаў, а таксама маральных уяўленняў вучняў.